ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.06.2023 № 169

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для I–V класаў першага аддзялення спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў і іншых устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі для навучэнцаў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» (далей – вучэбная праграма) прызначана для I–V класаў першага аддзялення спецыяльных школ, спецыяльных школ-інтэрнатаў для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана 406 часов гадзін: 60 гадзін ў I классе (2 гадзіны на тыдзень), 68 гадзін у II класе (2 гадзіны на тыдзень, 68 гадзін у III класе (2 гадзіны на тыдзень), 70 гадзін у IV класе (2 гадзіны на тыдзень), 140 гадзін у V класе (4 гадзіны на тыдзень).

Глава 2 вучэбнай праграмы ўключае інварыянтны і варыятыўны кампаненты. Выбар раздзелаў варыятыўнага кампанента ажыццяўляецца з улікам умоў арганізацыі навучання (спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат, спецыяльны клас, клас інтэграванага навучання і выхавання), ацэнкі складу навучэнцаў, магчымасцей матэрыяльна-тэхнічнай базы.

У главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы паказана прыкладная колькасць вучэбных гадзін, якая рэкамендуецца для засваення зместу раздзелаў інварыянтнага кампанента. Яна можа быць зменена ў межах агульнага аб’ёму вучэбнага часу з улікам выбару канкрэтных раздзелаў (падраздзелаў) варыятыўнага кампанента, наяўнасці прышкольнага вучэбна-вопытнага ўчастка, інтарэсаў навучэнцаў. Пры арганізацыі навучання ў V класе ўлічваецца таксама магчымасць правядзення вучэбных заняткаў як настаўнікам-дэфектолагам, так і настаўнікам на базе кабінетаў працоўнага навучання, вытворчых (вучэбна-вытворчых) майстэрняў і (або) вучэбна-вопытнага ўчастка.

Максімальны аб’ём вучэбных заняткаў на вывучэнне раздзелаў варыятыўнага кампанента: 4 гадзіны ў I класе, 16 гадзін ва II класе, 26 гадзін у III класе, 28 гадзін у IV класе, 70 гадзін у V класе. Пры выкарыстанні меншай колькасці гадзін на заняткі варыятыўнага кампанента адпаведна павялічваецца колькасць гадзін на заняткі па раздзелах інварыянтнай кампанента.

У I–IV класах усе раздзелы дадзенай вучэбнай праграмы вывучаюцца як хлопчыкамі, так і дзяўчынкамі. У V класе раздзелы «Работа з мяккім дротам», «Работа з драўнінай» прызначаны для вывучэння хлопчыкамі, іншыя раздзелы – як хлопчыкамі, так і дзяўчынкамі.

За кошт вучэбнага часу на першы з вывучаемых інварыянтных раздзелаў у кожным класе могуць планавацца ўводныя вучэбныя заняткі, на якіх вывучаюцца (замацоўваюцца, паўтараюцца) правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках па працоўным навучанні, праводзіцца нагляднае азнаямленне вучняў з відамі работ і вырабамі.

У класах інтэграванага навучання і выхавання дапускаецца планаванне і правядзенне вучэбных заняткаў па раздзелах: «Тэхналогія і грамадства», «Тэхналогія гаспадарання», «Я і свет тэхналогій», вылучаных у вучэбных праграмах па працоўным навучанні для I–IV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі; «Асновы дамаводства», «Рамонтныя

работы ў побыце», «Асновы вырошчвання раслін», вылучаных у вучэбных праграмах па працоўным навучанні для V класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» – стварэнне асновы фарміравання тэхналагічнай адукаванасці вучняў з дапамогай узбагачэння вопыту вучэбна-працоўнай дзейнасці і карэкцыі недахопаў яе развіцця.

4. Задачы:

фарміраванне матываў вучэбна-працоўнай дзейнасці;

фарміраванне цікавасці і паважлівых адносін да працы, станаўленне і ўмацаванне станоўчых якасцей асобы (працавітасць, мэтанакіраванасць, адказнасць, добрасумленнасць, дысцыплінаванасць, акуратнасць, беражлівасць, крытычнасць і іншыя якасці);

фарміраванне ведаў, неабходных для самастойнага і бяспечнага выканання вучэбна-працоўных заданняў;

прафесійнае інфармаванне ў межах вывучаемых відаў работ;

фарміраванне агульнапрацоўных уменняў (арыенціроўка ў заданні, планаванне, самакантроль, самаацэнка і іншыя ўменні), што садзейнічае развіццю пазнавальнай сферы псіхікі;

навучанне прыёмам выканання тэхналагічных аперацый і фарміраванне рухальных працоўных навыкаў, што садзейнічае развіццю дробнай (тонкай) маторыкі і зрокава-маторнай каардынацыі;

удакладненне перспектыў далейшай працоўнай падрыхтоўкі вучняў у межах выбару раздзелаў вучэбнай праграмы па працоўным навучанні VI–X класаў, па якіх яно будзе праводзіцца (V клас).

Для вырашэння ўказаных задач настаўнік плануе выкананне вырабаў і практычных работ, пералік якіх у дадзенай вучэбнай праграме вызначаны як пашыраны і прыкладны. Выбіраюцца тыя вырабы і практычныя работы, у рабоце над якімі можна найбольш паспяхова рэалізаваць задачы навучання. Настаўнік мае права планаваць выкананне іншых вырабаў, выкананне іншых практычных работ, у тым ліку прадугледжаных вучэбнымі праграмамі па працоўным навучанні для I–IV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Стварэнне вырабаў настаўнік можа планаваць па ўзоры, малюнку, фатаграфіі, слоўным апісанні, уяўленні аб натуральным прадмеце або ўласнай задуме, арыентуючыся пры гэтым на раздзел «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці навучэнцаў», які адлюстроўвае задачы фарміравання агульнапрацоўных уменняў.

5. Парадак вывучэння раздзелаў дадзенай вучэбнай праграмы вызначаецца настаўнікам, а вучэбны час на іх вывучэнне можа размяркоўвацца па паўгоддзях і вучэбных чвэрцях.

6. На вучэбных занятках выкарыстоўваюцца франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання. Іх выбар ажыццяўляецца з улікам умоў арганізацыі навучання і задач вывучэння канкрэтнай тэмы.

У класах інтэграванага навучання і выхавання правядзенне часткі вучэбных заняткаў прадугледжваецца асобна ад класа (агульнай групы працоўнага навучання), што вызначае неабходнасць узгаднення іх задач і зместу з задачамі і зместам вучэбных заняткаў у саставе класа (агульнай групы працоўнага навучання).

Метады навучання прымяняюцца з улікам магчымасцей і спецыфікі выкарыстання слоўных і наглядных сродкаў навучання, элементаў праблемнага навучання, неабходнасці спецыяльнай арганізацыі дзейнасці вучняў, этапаў вучэбных заняткаў.

7. Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў сфармуляваны ў дадзенай вучэбнай праграме па класах. З улікам розных магчымасцей вучняў яна з’яўляецца рознаўзроўневай.

Арыенціровачныя патрабаванні да развіцця агульнапрацоўных уменняў і звязаных з імі ўменняў арыентавацца ў прасторы, аналізаваць створаныя вырабы, даваць справаздачу аб выкананай рабоце, уменні выкарыстоўваць матэматычныя навыкі і ўменні пры навучанні па першым узроўні складанасці ўказаны па кожным класе. Пры навучанні

па другім узроўні складанасці настаўнік арыентуецца на гэтыя патрабаванні праграмы папярэдняга класа.

Навучанне па першым узроўні складанасці прадугледжвае вывучэнне названых у дадзенай вучэбнай праграме практычных работ, аперацый і прыёмаў працы і іх самастойнае выкананне на завяршальных вучэбных занятках па кожным відзе работ інварыянтнага кампанента дадзенай вучэбнай праграмы. Пры навучанні па другім узроўні складанасці выдзеленыя курсівам практычныя работы, аперацыі і прыёмы працы могуць выконвацца з дапамогай настаўніка на ўсіх навучальных занятках у дадзеным класе, вывучацца ў наступным класе або замяняцца на больш простыя.

Пры ацэнцы вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў неабходна ўлічваць, што ў дадзенай вучэбнай праграме ўказаны толькі тыя тэарэтычныя звесткі, аперацыі і прыёмы працы, якія з’яўляюцца новымі для вучняў у гэты перыяд навучання.

Найважнейшым вынікам навучання з’яўляецца таксама авалоданне вучнямі ўменнямі сацыяльнага ўзаемадзеяння: у выпадку неабходнасці звяртацца па дапамогу да дарослага або да таварыша пры выкананні практычнай работы, прымаць і аказваць дапамогу.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### I КЛАС (60 гадзін)

### ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ

#### Вырошчванне хатніх раслін (6 гадзін)[1]

[1] Тут і далей паказана прыкладная колькасць вучэбных гадзін, якая рэкамендуецца на вывучэнне раздзела.

Тэарэтычныя звесткі

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін на занятках па доглядзе хатніх раслін. Назвы і знешні выгляд найбольш распаўсюджаных хатніх раслін. Значэнне выкананых практычных работ для жыцця раслін і правілы іх выканання.

Экскурсіі у школьныя памяшканні, дзе растуць хатнія расліны.

Назіранні за ростам і развіццём хатніх раслін, іх адносінамі да святла і вільгаці (увесь перыяд навучання).

Практычныя работы

Догляд хатніх раслін (папярэдняе адстойванне вады, паліў з лейкі). Выдаленне сухога лісця, праціранне вазонаў і мыццё паддонаў.

#### Нарыхтоўка прыродных матэрыялаў (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі

Правілы паводзін падчас экскурсіі на прыроду. Агульныя экалагічныя патрабаванні да збору прыродных матэрыялаў. Правілы збору, апрацоўкі і захоўвання прыродных матэрыялаў (жалуды, каштаны, шышкі, сухія галінкі, ігліца, крылаткі), правілы бяспечных паводзін, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні пры выкананні дадзеных аперацый.

Аперацыі і прыёмы працы. Збор і першасная апрацоўка. Сарціроўка прыродных матэрыялаў і закладка іх на захоўванне.

Экскурсіі ў прыроду ў розную пару года з мэтай назапашвання ведаў аб прыродзе, збору прыродных матэрыялаў для наступнага стварэння вырабаў.

Работа з лісцем раслін (4 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі

Правілы паводзін на экскурсіі на прыроду. Правілы збору і апрацоўкі лісця, тэрміны іх выкарыстання. Правілы бяспечных паводзін, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў пры рабоце з лісцем. Характэрныя прыкметы лісця дрэў і кустоў, найбольш распаўсюджаных у найбліжэйшым асяроддзі. Змяненне колеру лісця восенню.

Экскурсія на прыроду з мэтай збору лісця.

Аперацыі і прыёмы працы. Збор і першасная апрацоўка (ачыстка) лісця.

Вырабы. Букеты з восеньскага лісця клёна, каштана, дуба ці іншых дрэў і кустоў: просты, камбінаваны.

Аплікацыя з лісця (6 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Крохкасць засушанага лісця. Правілы наклейвання лісця. Спалучэнне колеру лісця і фону выявы. Спалучэнне, паўтарэнне і чаргаванне ва ўзоры формы і колеру лісця.

Аперацыі і прыёмы працы. Выкладванне лісця. Наклейванне лісця.

Вырабы. Узоры ў паласе, квадраце, крузе па намечаных настаўнікам арыенцірах.

Работа з глінай і пластылінам (10 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Прымяненне гліны для вырабу прадметаў побыту. Абсталяванне рабочага месца (прызначэнне і размяшчэнне на рабочым месцы падкладной дошкі, вільготнай анучкі). Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін на занятках па лепцы. Спосабы падрыхтоўкі да работы з пластылінам (размінанне). Колеры гліны (белы, шэры, чырвоны, жоўты) і пластыліну (колеры і іх адценні ў выкарыстаным наборы).

Папярэднія (азнаямленчыя) практыкаванні. Драбленне сухой гліны, ссыпанне дробленай гліны ў ёмістасці. Выкананне дзеянняў (мяць на падкладной дошцы, у далонях, пальцамі, адрываць кавалачкі, рэзаць, рабіць адбіткі пальцаў і розных прадметаў, скрэбці, рабіць дзірачкі ў камяку матэрыялу і іншыя дзеянні). Практыкаванні ў адрозніванні навобмацак сухой і гатовай да работы гліны, пластыліну і гліны. Практыкаванні на пазнаванне ў ляпных вырабах рэальных аб’ектаў, на распазнаванне ў найбліжэйшым асяроддзі прадметаў з гліны (вазоны, паддоны, посуд і іншыя прадметы).

Назіранні за падрыхтоўкай настаўнікам гліны да работы, лепкай знаёмых вырабаў, лёгка пазнавальных прадметаў (грыб, груша, іншыя прадметы).

Аперацыі і прыёмы працы. Размінанне пластыліну на падкладной дошцы, у далонях і пальцамі. Скручванне шара на падкладной дошцы і кругавымі рухамі паміж далонямі. Раскручванне невялікіх кавалачкаў пластыліну і гліны далонню на падкладной дошцы, паміж далонямі (прамымі рухамі) у валік. Разразанне валіка пластмасавым нажом (стэкай). Складанне вырабу.

Вырабы. Простыя вырабы, выкананыя шляхам фармавання гліны адмысловымі формамі, накрыўкамі ад слоічкаў, скрыначкамі ці іншымі прадметамі. Вароты, лесвічка, хатка, караблік і іншыя прадметныя выявы, выкананыя на плоскасці з «палачак» рознай даўжыні.

Работа з паперай (20 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Уласцівасці паперы. Папера тоўстая і тонкая. Колеры паперы. Прызначэнне паперы. Правілы бяспечных паводзін і санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні на занятках з паперай. Выкарыстанне паперы ў паўсядзённым жыцці. Асаблівасці паверхні, магчымасць згінання, разрывання, рэзання паперы, страта трываласці пры намаканні. Клеявыя саставы. Правілы бяспечных паводзін, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні пры рабоце з нажніцамі і клеявымі саставамі. Правілы абвядзення шаблонаў, рэзання і наклейвання.

Назіранне за выкарыстаннем прадметаў з паперы.

Папярэднія (азнаямленчыя) практыкаванні. Змінанне, разгладжванне далонню, разрыванне, адрыванне невялікіх кавалачкаў, згінанне ў розных напрамках, разгінанне.

Аперацыі і прыёмы працы. Складванне паперы (размяшчэнне ліста паперы на стале, адгінанне часткі ліста, сумяшчэнне бакоў і вуглоў ліста, прагладжванне згібу. Разметка па шаблонах. Рэзанне нажніцамі па прамой лініі згібу (прытрымліванне нарыхтоўкі адной рукой, правільная хватка нажніц пальцамі другой рукі, шырокае развядзенне лёзаў нажніц і няпоўнае іх звядзенне). Наклейванне з выкарыстаннем клеявога алоўка (размяшчэнне дэталі наклейваемым бокам уверх, правільнае трыманне інструмента, раўнамернае нанясенне клею на наклейваемую дэталь ад цэнтра да краю, размяшчэнне дэталі на месцы наклейвання, прыцісканне і прагладжванне дэталі анучкай) і пэндзліка (наліванне клейстару або клею, абмакванне пэндзліка ў клеявы састаў, абціранне лішкаў клею, нанясенне і разраўноўванне нанесенага на дэталь клеявога саставу).

Вырабы, практычныя работы. Змінанне адходаў паперы ў камякі, змяшчэнне іх у кошык для смецця. Шарыкі з тонкай (напрыклад, газетнай) паперы, выкананне з імі гульнявых (займальных) дзеянняў. «Сняжынкі» (невялікія кавалачкі белай паперы), выкананне з імі гульнявых (займальных) дзеянняў. Абкручванне тонкай каляровай паперай невялікіх прадметаў цыліндрычнай і шарападобнай форм (цацачныя цукеркі ў абгортцы). Складанне сурвэтак рознымі спосабамі (з размяшчэннем іх у сурвэтніцах). Кніжачка з сагнутых палосак паперы. Геаметрычныя фігуры (дыдактычны матэрыял), папярэдне размечаныя складваннем і па шаблоне. Закладкі, паштоўкі і іншыя вырабы, упрыгожаныя аплікатыўнымі дэталямі (асноўныя часткі і дэталі аплікацый прапануюцца ў гатовым выглядзе).

Скульптура малых форм з прыродных матэрыялаў і пластыліну (4 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі

Падабенства і адрозненне шышак хвоі і елкі, крылатак ясеня і клёну. Форма шышак, каштанаў, жалудоў.

Аперацыі і прыёмы працы. Лепка простых дэталей вырабаў з пластыліну, злучэнне прыродных матэрыялаў і пластыліну. Размяшчэнне і замацаванне вырабаў на падстаўцы.

Вырабы. Грыб (ножка з пластыліну, шапачка з каштана; ножка з жолуда, шапачка з пластыліну); страказа (тулава з пластыліну, крылцы з крылатак клёну) і іншыя вырабы.

Вышыванне на паперы або кардоне (падрыхтоўка да вышывання па праколах) (4 гадзіны)

Практыкаванні ў выкананні шнуроўкі ў выглядзе геаметрычных фігур і прадметных выяў з нескладаным контурам праз адтуліны ў кардоне, якія паступова памяншаюцца.

Вырабы. Выявы геаметрычных фігур, садавіны, гародніны і іншых прадметаў.

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ (4 гадзіны)

Вырошчванне раслін на прышкольным вучэбна-доследным участку

Тэарэтычныя звесткі

Расліны прышкольнага вучэбна-доследнага ўчастка і іх плады. Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры рабоце на вучэбна-доследным участку. Значэнне выдалення пустазелля.

Назіранне за ўборкай ураджаю і восеньскай апрацоўкай глебы.

Восеньскія практычныя работы. Збор насення аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання і закладка на захоўванне.

Вясновыя практычныя работы. Выдаленне пустазелля.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ
ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ І КЛАСА

Вучні ведаюць:

назвы вывучаных хатніх раслін у памяшканнях школы;

вывучаныя матэрыялы для дзіцячай працы і звесткі аб іх;

абсталяванне для практычных работ, якія выконваліся, і вывучаныя звесткі пра яго;

прызначэнне, паслядоўнасць і правілы выканання вывучаных аперацый;

прызначэнне вырабаў (магчымасці іх выкарыстання ў гульнявой дзейнасці, побыце).

Вучні ўмеюць:

выконваць асноўныя прыёмы, якія ўваходзяць у састаў вывучаных аперацый апрацоўкі матэрыялаў для дзіцячай працы і па доглядзе хатніх раслін;

паўтараць папярэдне вылучаныя настаўнікам прыкметы вырабу на першых занятках па кожным з відаў работ; на наступных занятках – аналізаваць узор вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка;

арыентавацца з дапамогай настаўніка на плоскасці і ў трохмернай прасторы;

выкарыстоўваць у працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах вучэбных заняткаў паняцці, якія фарміруюцца ў прапедэўтычны перыяд навучання матэматыцы;

выконваць работы па паказе і слоўнай інструкцыі настаўніка, планаваць знаёмую бліжэйшую аперацыю;

называць выкананыя аперацыі і іх паслядоўнасць з дапамогай настаўніка;

кантраляваць прамежкавыя вынікі работы, параўноўваць створаны выраб з узорам з дапамогай настаўніка;

ажыццяўляць самаацэнку з дапамогай настаўніка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў і правілы бяспечных паводзін, правілы арганізацыі рабочага месца на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў працэсе пазаўрочнай працоўнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уяўленні аб прыродных матэрыялах (форма, колер і іншыя характарыстыкі) пры іх падборы з дапамогай настаўніка для вырабаў, якія ствараюцца.

## II КЛАС (68 гадзін)

## ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ

### Вырошчванне хатніх раслін (4 гадзіны)

#### Тэарэтычныя звесткі

Правілы размяшчэння хатніх раслін з улікам патрэбы ў святле. Значэнне выкананых практычных работ для жыцця раслін і правілы іх выканання. Чаранок. Умовы ўкаранення чаранкоў.

Назіранні за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, з’яўленнем каранёў.

Экскурсіі ў школьныя памяшканні, дзе растуць хатнія расліны.

#### Практычныя работы

Выдаленне пылу (з буйнога скурыстага лісця – вільготнай анучкай, з апушанага лісця – пэндзлікам; апырскванне раслін са шчыльным скурыстым лісцем з ручнога апырсквальніка або распыляльніка). Чаранкаванне (дапамога настаўніку ў выкананні размнажэння хатніх раслін чаранкамі).

### Работа з глінай і пластылінам (10 гадзін)

#### Тэарэтычныя звесткі

Падабенства і адрозненне пластычных уласцівасцей гліны і пластыліну, змяненне пластычных уласцівасцей пры высыханні гліны і ахаладжванні пластыліну. Спосабы падрыхтоўкі гліны да работы (замочванне і замешванне). Прыкметы гатоўнасці гліны да работы. Рэльеф як адзін з відаў лепкі.

Аперацыі і прыёмы працы. Скочванне шара на падкладной дошцы і кругавымі рухамі паміж далонямі. Раскочванне «палачак», злучэнне канцоў «палачак» рознай даўжыні з прымазваннем месца злучэння (кальцо). Размяшчэнне кольцаў рознага

дыяметра адносна адно аднаго, захаванне прапорцый. Уціскание невялікіх паглыбленняў указальным пальцам. Раскочванне шара ў далонях у авал і конус, расплюшчванне шара, разразанне шара ніткай на дзве палавінкі. Атрыманне грушападобнай формы (сплюшчванне і выцягванне часткі шара). Разразанне пластычных матэрыялаў стэкай, расплюшчванне «трубачкі», апрацоўка дэталей вырабаў пальцамі і стэкай для надання ім роўнай паверхні і абазначэння граняў.

Вырабы. Кольцы, ланцужкі. Пірамідка з кольцаў. Прадметы шарападобнай формы (лялька-неваляшка, апельсіны, яблыкі і іншыя прадметы). Кампазіцыя «Садавіна на падносе» (калектыўная работа; паднос прапануецца гатовы). Прадметы авальнай, канічнай, грушападобнай форм (сліва, агурок, морква, груша і іншыя прадметы). Снегавік з шароў і з кругоў (на плоскасці), пірамідка з кругоў. Грыб з дзвюх палавінак шара. Рэльефныя выявы літар і лічбаў.

Аплікацыя з лісця (10 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Правілы засушвання лісця. Стылізацыя формы (у працэсе практыкаванняў па параўнанні форм асноўных частак паказаных аб’ектаў з формамі рознага лісця або іх палавінкамі).

Экскурсія на прыроду з мэтай пашырэння ведаў аб разнастайнасці прыродных матэрыялаў, збору лісця.

Аперацыі і прыёмы працы. Выдаленне чаранка, засушванне лісця. Разразанне ліста на дзве часткі. Абразанне «зубчыкаў».

Вырабы. Арнаменты ў паласе, квадраце, крузе. Прадметная аплікацыя: «Караблік», «Парашут», «Грыб», «Птушачка», «Рыбка» і іншыя работы.

Скульптура малых форм з прыродных матэрыялаў і пластыліну (6 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Стылізацыя формы пры выкананні аб’ёмных вырабаў. Падабенства прыродных матэрыялаў з адлюстраванымі аб’ектамі паводле іншых уласцівасцей (колкасць іголак, лускаватасць і выпукласць паверхні шышак і іншыя ўласцівасці). Правілы складання кампазіцыі з выяў розных прадметаў.

Экскурсіі на прыроду з мэтай збору прыродных матэрыялаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Лепка і прымацаванне дробных дэталей выявы (вочы, вушкі і іншыя дэталі).

Вырабы. Караблік са шкарлупіны грэцкага арэха, палачкі (мачта), ліста дрэва (ветразь), пластыліну (злучальны матэрыял); павук (тулава са шкарлупіны грэцкага арэха, лапкі з тонкіх палачак або дроту далучаюцца да пластыліну, якім запаўняецца тулава); вожык (тулава з пластыліну, іголкі з ігліцы або абламаных крылатак ясеня, шалупіны семак сланечніка); рыбка (тулава з шышкі, плаўнікі з пластыліну, хвост з пяра або пластыліну); мышка (тулава з нераскрытай хваёвай шышкі, вушкі і вочы з пластыліну, хвост з пластыліну або дроту). Кампазіцыі з названых і раней створаных вырабаў («Вожык і грыбы» і іншыя кампазіцыі з ужываннем моху, галінак туі, хвоі, елкі).

Вышыванне на паперы або кардоне (6 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Выкарыстанне нітак. Уласцівасці нітак: таўшчыня, колер, ірвуцца, намотваюцца. Адрозненне нітак паводле прызначэння (швейныя, для вышывання, для вязання) і паводле асаблівасцей (таўшчыня, трываласць, колер). Адпаведнасць таўшчыні ніткі і іголкі. Спалучэнне колеру нітак з колерам вырабу. Інструменты (нажніцы, іголкі) і прыстасаванні (ігольніцы, напарсткі) для работы. Правілы бяспечнага захоўвання іголак. Прызначэнне і прымяненне напарстка. Арганізацыя рабочага месца, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні і правілы бяспечных паводзін пры вышыванні. Пачатковыя звесткі аб прафесіі швачкі.

Экскурсія ў школьную швейную майстэрню.

Папярэднія (азнаямленчыя) практыкаванні. Разборка нітак і сарціроўка іх па колеры, таўшчыні. Разрыванне тонкіх нетрывалых нітак. Намотванне нітак на шпульку, кардон, змотванне ў клубок. Адразанне нітак.

Аперацыі і прыёмы працы. Дапаможныя: адмотванне і адразанне ніткі, уцягванне ніткі ў іголку з шырокім вушкам, правільная хватка іголкі і ніткі. Асноўныя: выкананне праколаў, замацаванне ніткі ў пачатку вышывання (выкананне некалькіх шыўкоў на адным месцы), выкананне шыўкоў па контуры выявы спосабам «іголка ўверх – іголка ўніз» па праколах і з самастойным праколваннем у адзін і два прыёмы (прашываецца адлегласць паміж шыўкамі), замацаванне ніткі ў канцы вышывання. Штрыхоўка ўнутры контуру фігуры.

Вырабы. Выявы геаметрычных фігур (вышываюцца па гатовых праколах). Выявы гародніны і садавіны (пры вышыванні з самастойным праколваннем кропкавы контур выконваецца або настаўнікам, або вучнямі па трафарэце) з наступным размалёўваннем.

Работа з паперай (16 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Разнастайнасць вырабаў з паперы. Віды аплікацыі з паперы (прадметная, сюжэтная, геаметрычны і раслінны арнаменты), выкарыстанне аплікацыі з паперы ў якасці пано і для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Спалучэнне колераў паперы паміж сабой і з колерам фону, правілы захавання прапорцый, рытму, сіметрыі (практычнае знаёмства без выкарыстання названых навуковых паняццяў), папярэдняе размяшчэнне элементаў аплікацыі.

Аперацыі і прыёмы працы. Згінанне і складванне паперы. Рэзанне нажніцамі па дузе (шырокае развядзенне лёзаў нажніц і рэзанне іх часткай, якая прымыкае да восі-шарніру, напрамак загатоўкі ў патрэбны бок другой рукой). Наклейванне адносна невялікіх дэталей спосабам «ад дошкі» (нанясенне тонкага роўнага пласта клею ці клейстару на дошку, фанеру, пластык, цырату ці іншыя матэрыялы з роўнай паверхняй, укладванне дэталей вываратным бокам на клеявы састаў, зняцце дэталяў з клеявога саставу і наклейванне на сваё месца ў вырабе, прагладжванне анучкай праз сурвэтку).

Вырабы. Пакеты, шкляначкі, пакуначкі розных канструкцый, выраблены спосабам складання. Простыя ёлачныя гірлянды («ланцужок», са сцяжкоў). Паштоўкі і закладкі, упрыгожаныя прадметнай аплікацыяй і аплікацыяй у выглядзе геаметрычнага і расліннага арнаментаў.

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ (16 гадзін)

Работа з падручнымі матэрыяламі

Тэарэтычныя звесткі

Ужыванне падручных матэрыялаў (шпагат, саломінкі для кактэйлю) для стварэння простых вырабаў. Выкарыстаныя пры стварэнні вырабаў уласцівасці шпагату і саломінак для кактэйлю. Абсталяванне рабочага месца, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ з выкарыстаннем шпагату і саломінак для кактэйлю.

Аперацыі і прыёмы працы. Адмотванне і разразанне шпагату. Выкананне частак выявы са шпагату. Наклейванне шпагату. Нанізванне трубачак для кактэйлю.

Вырабы. Кветка са шпагату, падвескі з трубачак для кактэйлю.

Сіметрычнае выразанне

Тэарэтычныя звесткі

Паслядоўнасць стварэння сіметрычна выразаных малюнкаў, асаблівасці і правілы размяшчэння шаблонаў, зрэз якіх прыкладзены да згібу. Правілы выразання па крывых лініях.

Аперацыі і прыёмы працы. Выразанне са складзенага ўдвая аркуша шчыльнай паперы выяў, якія маюць плаўны контур. Размалёўванне выяў, наклейванне і дамалёўка на іх асобных дэталей (афармленне ў выглядзе лічыльнага матэрыялу, паштовак).

Вырабы. Сіметрычныя выявы прадметаў з адносна нескладаным контурам (груша, грыб і іншыя прадметы). Паштоўкі ў форме авала, сардэчка. Гірлянда.

Аб’ёмная аплікацыя з паперы

Тэарэтычныя звесткі

Спалучэнне колеру фону і колеру аплікатыўнай выявы. Спалучэнне аб’ёмнай аплікацыі з плоскаснай і малюнкам.

Аперацыі і прыёмы працы. Згінанне і складанне паперы. Выразанне асобных дэталей аб’ёмнай аплікатыўнай выявы па лініях разметкі. Склейванне дэталей аплікацыі, наклейванне элементаў аплікацыі або ўсёй аплікатыўнай выявы на фон.

Вырабы. Выявы прадметаў, атрыманых пры дапамозе выразання, рознай складанасці згінання і складання паперы (кветкі, фігуркі птушак, звяроў і іншыя прадметы).

Вырошчванне раслін на прышкольным вучэбна-доследным участку

Тэарэтычныя звесткі

Значэнне выкананых восеньскіх і вясновых практычных работ.

Назіранне за ўборкай ураджаю, перакопкай глебы і іншымі работамі па восеньскай апрацоўцы глебы.

Восеньскія практычныя работы. Падрыхтоўка градак да апрацоўкі (выдаленне пустазелля і рэшткаў раслін). Удзел ва ўнясенні перагною.

Вясновыя практычныя работы. Выдаленне пустазелля.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ II КЛАСА

Вучні ведаюць:

назвы вывучаных хатніх раслін у памяшканнях школы;

вывучаныя матэрыялы для дзіцячай працы і звесткі аб іх;

абсталяванне для практычных работ, якія выконваліся, і вывучаныя звесткі пра яго;

прызначэнне, паслядоўнасць і правілы выканання вывучаных аперацый;

прызначэнне выкананых вырабаў (магчымасці іх выкарыстання ў гульнявой дзейнасці, побыце, на вучэбных занятках).

Вучні ўмеюць:

выконваць асноўныя прыёмы, якія ўваходзяць у састаў вывучаных аперацый апрацоўкі матэрыялаў для дзіцячай працы і па доглядзе хатніх раслін;

выкарыстоўваць эканомна матэрыялы для дзіцячай працы;

аналізаваць узор вырабу па пытаннях і з дапамогай настаўніка (першае паўгоддзе);

арыентавацца ў заданні па пытаннях настаўніка з апорай на ўзор вырабу (другое паўгоддзе);

арыентавацца на плоскасці і ў трохмернай прасторы з дапамогай настаўніка; даваць прасторавую характарыстыку аб’ектаў і іх частак з указаннем двух-трох характэрных прыкмет у адказ на пытанне настаўніка;

выконваць работы па паказе і слоўнай інструкцыі настаўніка (першае паўгоддзе);

планаваць знаёмую бліжэйшую аперацыю (першае паўгоддзе);

планаваць бліжэйшую аперацыю ў працэсе практычнай работы з выкарыстаннем тэхналагічнай карты (другое паўгоддзе);

называць выкананыя аперацыі і іх паслядоўнасць;

кантраляваць прамежкавыя вынікі, параўноўваць створаны выраб з узорам па пытаннях і з дапамогай настаўніка, якая паслядоўна скарачаецца;

выкарыстоўваць з дапамогай настаўніка ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах вучэбных заняткаў веды, атрыманыя на вучэбных занятках па іншых вучэбных прадметах;

ажыццяўляць самаацэнку з дапамогай настаўніка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін, правілы арганізацыі рабочага месца на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў працэсе пазаўрочнай працоўнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уяўленні аб прыродных матэрыялах (форма, колер і іншыя характарыстыкі) пры іх падборы з дапамогай настаўніка для ствараемых вырабаў;

вырашаць з дапамогай настаўніка простыя задачы на даканструяванне (падбор адсутных элементаў) у працэсе арыенціроўкі ў заданні.

III КЛАС
ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ (68 гадзін)

Вырошчванне хатніх раслін і раслін кветніка (4 гадзіны)
Тэарэтычныя звесткі

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры размнажэнні раслін сцябловымі і ліставымі чаранкамі і падрыхтоўцы глебы. Назвы і знешні выгляд хатніх раслін, якія раней не вывучаліся.

Асаблівасці догляду чаранкоў раслін, якія патрэбна размножыць. Патрабаванні гэтых раслін да святла, вільгаці, цяпла і земляной сумесі.

Знешні выгляд вывучаемых кветкава-дэкаратыўных раслін і іх насення.

Прыкметы паспявання, правілы збору, падрыхтоўкі да захоўвання і захоўвання насення аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін.

Назіранне за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, з’яўленнем каранёў, змяненнем колеру лісця традэсканцыі ў залежнасці ад асвятлення, развіццём укаранёных чаранкоў бальзаміну або іншых раслін.

Практычныя работы

Размнажэнне хатніх раслін (традэсканцыя або іншыя расліны) сцябловымі чаранкамі (падрыхтоўка глебы, нарыхтоўка чаранкоў, укараненне чаранкоў ў вадзе, высадка ў глебу). Размнажэнне хатніх раслін (бягонія, бальзамін, плюшч звычайны або іншыя расліны) ліставымі і (або) сцябловымі чаранкамі (падрыхтоўка рассадных скрынь, вазонаў, нарыхтоўка чаранкоў, пасадка чаранкоў для ўкаранення і догляд за імі, перасадка ў вазоны[2].

[2] Замест вучэбных заняткаў з указанымі практычнымі работамі могуць быць праведзены паўторна-абагульняльныя ўрокі з практычнымі работамі па доглядзе хатніх раслін, вырошчванні раслін на прышкольным вучэбна-доследным участку, якія выконваліся ў I–II класах.

Збор насення аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання і закладка на захоўванне.

Работа з глінай і пластылінам (8 гадзін)
Лепка на плоскасці
Тэарэтычныя звесткі

Віды рэльефу (нагляднае адрозненне без выкарыстання тэрміналогіі). Выкарыстанне раслінных форм у беларускім дэкаратыўным мастацтве (нагляднае знаёмства).

Прыёмы лепкі на плоскасці. Расплюшчванне і расціранне пластычных матэрыялаў, атрыманне выяў рознай выпукласці, нанясенне малюнка і падраўноўванне контуру выявы стэкай; расціранне пластыліну на пластыліне для атрымання рознакаляровай выявы.

Вырабы. Вішні на галінцы, грыб, морква, яблык, сліва, груша, цюльпан, галінка з лісцем і іншыя вырабы.

Аб’ёмныя работы
Тэарэтычныя звесткі

Прымяненне гліны для вырабу посуду. Беларуская гліняная цацка.

Прыёмы лепкі полых прадметаў. Уцісканне, расплюшчванне і выцягванне сценак; выкананне малюнка стэкай; лепка дробных дэталей.

Вырабы. Кубак, сподак, вядзерца, талерка, вазон, кубачак і іншыя прадметы з гліны або пластыліну. Кампазіцыі з названых прадметаў.

Скульптура малых форм
з прыродных матэрыялаў і пластыліну (6 гадзін)
Тэарэтычныя звесткі

Асаблівасці формы і паверхні, памеры, колер, трываласць і іншыя прыкметы раней не выкарыстаных прыродных матэрыялаў (ягады шыпшыны і іншыя матэрыялы). Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з дротам. Матэрыялы для падстаўкі. Кампазіцыйны цэнтр, пярэдні і задні план кампазіцыі макета, асаблівасці іх вылучэння. Правілы падрыхтоўкі кампазіцыі да выставы.

Экскурсія на прыроду з мэтай збору прыродных матэрыялаў, на школьныя і іншыя выставы работ з прыродных матэрыялаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Злучэнне дэталей вырабу палачкамі або кавалачкамі дроту (пракалванне адтулін для злучэння дэталей выконваецца настаўнікам). Папярэдняе размяшчэнне дэталей макета на падстаўцы.

Вырабы. Рыбка са шкарлупіны грэцкага арэха (тулава), лісця ці паперы (плаўнікі), пластыліну; чарапаха са шкарлупіны грэцкага арэха (тулава) і пластыліну; птушачка з шышкі (тулава), невялікага жолуда або ягады шыпшыны (галава), невялікага лісця, пёрак або пластыліну (крылы), палачак або дроту (злучальныя дэталі); пінгвін з шышкі (тулава), крылатак клёну (крылы), плюсак жалудоў (ногі), пластыліну, палачак або дроту (галава, злучальныя дэталі) і іншыя вырабы. Макеты: «Узлесак», «Вожык на лясной паляне», па матывах казкі «Калабок» і іншыя макеты.

Работа з паперай і кардонам (16 гадзін)
Тэарэтычныя звесткі

Тэхнічныя ўласцівасці кардону (у параўнанні з уласцівасцямі паперы), яго прымяненне на ўроках працы і ў побыце. Правілы абклейвання кардону паперай. Правілы сіметрычнага выразання. Адпаведнасць формы краю вырабу (закладкі, паштоўкі) і арнаменту.

Аперацыі і прыёмы працы. Рэзанне кардону. Абклейванне кардону паперай (змазванне ўсёй паверхні папяровай дэталі клеем і наклейванне). Сіметрычнае выразанне прадметаў з контурам, які плаўна змяняецца. Замацаванне ніткі-пятлі паміж часткамі ёлачнай цацкі.

Вырабы. Лічыльны матэрыял у выглядзе геаметрычных фігур (кардон, абклеены каляровай паперай з аднаго або двух бакоў).

Плоскія ёлачныя цацкі (грушы, грыбы, ялінкі і (або) іншыя цацкі з кардону, абклеенага паперай), гірлянды з іх. Аб’ёмныя ёлачныя цацкі («ліхтарыкі», «кошык»).

Паштоўкі рознай формы (асноўная частка вырабу выконваецца спосабамі згінання нарыхтоўкі ўдвая і сіметрычнага выразання), упрыгожаныя арнаментам або прадметнай аплікацыяй.

Закладкі з кардону з трохвугольнымі і закругленымі бакамі, упрыгожаныя геаметрычным і раслінным арнаментамі.

Работа з тэкстыльнымі матэрыяламі (8 гадзін)
Тэарэтычныя звесткі

Гузікі, іх адрозніванне паводле памераў, колькасці адтулін, прызначэння. Пашырэнне ведаў аб тканінах, іх адрозніванне паводле прызначэння і знешніх прыкмет (таўшчыня, асаблівасці паверхні, колер).

Віды тканін па паходжанні валокнаў. Адрозненне тканін з натуральных (ільняныя, баваўняныя, шарсцяныя, шаўковыя) і хімічных валокнаў. Правы і вываратны бок тканін. Адпаведнасць колеру і таўшчыні нітак для вышывання вырабу.

Фастрыга (шво «наперад іголку»). Знешні выгляд і правілы выканання фастрыгі, яго выкарыстанне для ўпрыгожвання вырабаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Выраб выкрайкі з кардону або паперы (разметка па шаблоне, выразанне) і раскрой тканіны.

Прыёмы работы з ніткай і іголкай. Адмерванне ніткі патрэбнай даўжыні, уцягванне ніткі ў іголку, завязванне вузельчыка, замацаванне ніткі на тканіне ў канцы работы.

Прыёмы прышывання гузікаў. Прышыванне гузікаў з дзвюма адтулінамі ўшчыльную да тканіны. Прышыванне гузікаў з дзвюма адтулінамі з утварэннем «ножкі».

Вышыванне фастрыгай (шво «наперад іголку») аднолькавымі шыўкамі па вызначанай лініі. Вышыванне фастрыгай у два прыёмы (шыўкі другога шва знаходзяцца паміж шыўкамі першага шва).

Эканомны расход матэрыялу.

Вырабы. Калекцыя тканін (гатовыя ўзоры тканін замацоўваюцца на кардоне гузікамі). Закладка з тканіны, упрыгожаная трыма-чатырма фастрыгамі (па гатовым крої, месцы праколаў размячаюцца па трафарэце).

Закладкі і сурвэткі з тканіны, упрыгожаныя рознымі выявамі, выкананымі фастрыгай (у адзін і два прыёмы).

## ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ (26 гадзін)

### Работа з падручнымі матэрыяламі

Тэарэтычныя звесткі

Ужыванне падручных матэрыялаў (кардонныя скрынкі, пластмасавыя шкляначкі, слоічкі, шпагат) у спалучэнні з іншымі матэрыяламі (папера, скотч, лейкапластыр, ніткі) для стварэння простых вырабаў. Выкарыстанне пры стварэнні вырабаў формы матэрыялу. Абсталяванне рабочага месца, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ з выкарыстаннем падручных матэрыялаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Наклейванне, абклейванне, разразанне матэрыялаў.

Вырабы. Аловачніца, вазачка для алоўкаў, стылізаваныя фігуркі жывёл.

### Аб’ёмная аплікацыя з паперы

Тэарэтычныя звесткі

Выкарыстанне аб’ёмнай аплікацыі для ўпрыгожвання паштовак і запрашальных білетаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Выразанне асобных дэталей аплікатыўнай выявы па лініях разметкі і «на вока». Наклейванне ўпрыгожвальных дэталей з фольгі, ваты і іншых матэрыялаў.

Вырабы. Паштоўкі і запрашальныя білеты, упрыгожаныя ўклеенай унутр або наклеенай звонку аб’ёмнай аплікацыяй.

### Сіметрычнае выразанне

Тэарэтычныя звесткі

Выкарыстанне сіметрычнага выразання (выцінанкі) для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Спосабы наклейвання выцінанак.

Аперацыі і прыёмы працы. Выразанне са складзенага ўдвая аркуша паперы па лініях ускладненай канфігурацыі (ламаныя, якія рэзка змяняюць напрамак). Наклейванне выявы спосабам «ад дошкі» і з нанясеннем на выяву клею пэндзлікам.

Вырабы. Закладкі, упрыгожаныя выцінанкамі ў выглядзе паслядоўна ўскладненага геаметрычнага або расліннага арнаменту. Паштоўка, упрыгожаная арнаментам, выкананым спосабам сіметрычнага выразання.

### Аплікацыя з прыродных матэрыялаў

Тэарэтычныя звесткі

Правілы нарыхтоўкі насення раслін (кавун, дыня, гарбуз), нарыхтоўкі і засушвання раслін. Абсталяванне рабочага месца, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ з насеннем раслін і засушанымі раслінамі.

Аперацыі і прыёмы працы. Падрыхтоўка да работы насення раслін, засушванне раслін. Наклейванне насення, кветак і іншых частак раслін.

Вырабы. Арнаменты з насення раслін. Аплікацыі з частак засушаных раслін.

Вырошчванне раслін на прышкольным вучэбна-доследным участку

Тэарэтычныя звесткі

Значэнне восеньскіх работ на прышкольным вучэбна-доследным участку. Знешні выгляд вывучаемых раслін і іх насення. Глыбіня разорак пры пасеве насення розных культур. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з граблямі. Захоўванне грабель. Значэнне праполкі.

Практыкаванні ў распазнаванні насення і распазнаванні ўсходаў культурных раслін і пустазелля.

Назіранне за ўнясеннем угнаенняў і падкормам раслін.

Восеньскія практычныя работы. Падрыхтоўка прышкольнага вучэбна-доследнага ўчастка да восеньскай апрацоўкі глебы (уборка лісця, галінак, рэшткаў раслін).

Вясновыя практычныя работы. Сарціроўка і адбор паўнавартаснага насення фасолі, гароху, бобу, гарбуза, кабачкоў, буракоў, аднагадовых кветкава-дэкаратыўных раслін. Рыхленне і разраўноўванне глебы граблямі пасля перакопкі (перакопка выконваецца вучнямі старшых класаў). Правядзенне разорак рознымі спосабамі. Паштучны пасеў буйнога насення на зададзенай адлегласці з дапамогай меркі, пасеў зяленіўных культур, зараўноўванне зямлі перагноем. Паліў пасеваў пасля зараўноўвання і паліў усходаў. Рыхленне глебы. Праполка. Збор зяленіўных культур.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ III КЛАСА

Вучні ведаюць:

назвы вывучаных хатніх раслін у памяшканнях школы і раслін кветніка;

вывучаныя матэрыялы для дзіцячай працы і звесткі аб іх;

абсталяванне для практычных работ, якія выконваліся, і вывучаныя звесткі пра яго;

прызначэнне, паслядоўнасць і правілы выканання вывучаных аперацый;

прызначэнне выкананых вырабаў (магчымасці іх выкарыстання ў гульнявой дзейнасці, побыце, на вучэбных занятках).

Вучні ўмеюць:

выконваць асноўныя прыёмы, якія ўваходзяць у склад вывучаных аперацый апрацоўкі матэрыялаў для дзіцячай працы, па доглядзе хатніх раслін і раслін кветніка;

выкарыстоўваць эканомна матэрыялы для дзіцячай працы;

арыентавацца ў заданні з апорай на ўзор, малюнак, натуральны прадмет або ўяўленне аб прадмеце па пытаннях настаўніка (пры выкананні новых відаў вырабаў) і самастойна (пры выкананні вырабаў, аналагічных выкананым раней);

самастойна арыентавацца на плоскасці і ў трохмернай прасторы; даваць прасторавую характарыстыку аб'ектам і іх часткам з указаннем дзвюх-трох прыкмет;

папярэдне планаваць усе этапы работы і даваць справаздачу аб яе выкананні па пытаннях настаўніка (пры вырабе новых або больш складаных вырабаў) і самастойна (з апорай на тэхналагічную карту);

ажыццяўляць бягучы самакантроль вынікаў выканання знаёмых аперацый;

аналізаваць выкананыя вырабы і параўноўваць іх з узорам па навадных пытаннях настаўніка;

прымяняць з дапамогай настаўніка ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах вучэбных заняткаў веды, атрыманыя на вучэбных занятках па іншых вучэбных прадметах;

ажыццяўляць самаацэнку з дапамогай настаўніка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін, правілы арганізацыі рабочага месца на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў працэсе пазаўрочнай працоўнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уяўленні аб прыродных матэрыялах (форма, колер і іншыя характарыстыкі) пры іх падборы з дапамогай настаўніка для ствараемых вырабаў;

вырашаць з дапамогай настаўніка простыя задачы на даканструяванне (падбор адсутных элементаў) і пераканструяванне (змена асобных элементаў) у працэсе арыенціроўкі ў заданні.

IV КЛАС (70 гадзін)
ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ

Вырошчванне хатніх раслін і раслін кветніка (2 гадзіны)
Тэарэтычныя звесткі

Знешнія прыкметы дзярновай, ліставой, тарфяной зямлі, пяску. Агульнае ўяўленне аб разнастайнасці земляных сумесей. Тэрміны ўкаранення чаранкоў. Залежнасць пасадачнага матэрыялу ад саставу земляной сумесі.

Назіранне за нарыхтоўкай чаранкоў настаўнікам, развіццём укаранелых чаранкоў.

Практычныя работы

Нарыхтоўка ў найбліжэйшым асяроддзі зямлі, пяску на зіму для падрыхтоўкі земляных сумесей. Размнажэнне хатніх раслін ліставымі і сцябловымі чаранкамі, якія хутка ўкараняюцца (практычнае паўтарэнне)[3].

[3] Калі ў III класе размнажэнне хатніх раслін сцябловымі чаранкамі замянялася іншымі відамі работ, то праводзяцца ўрокі вывучэння новага матэрыялу.

Збор насення кветкава-дэкаратыўных раслін (практычнае паўтарэнне).

Работа з глінай і пластылінам (8 гадзін)
Тэарэтычныя звесткі

Уяўленне аб стылізаванай выяве, перадачы руху ў ляпной фігуры, расчляненні аб’екта на простыя формы, захаванні прапорцый. Народная гліняная цацка.

Аперацыі і прыёмы працы. Выбар колеру пластыліну. Лепка складаных па форме стылізаваных выяў жывёл і людзей з цэлага кавалка шляхам выцягвання і іх складанне з асобных частак шляхам прымазвання адной часткі да другой, лепка камбінаваным спосабам. Лепка частак выявы, якія забяспечваюць апазнаванне чалавечага персанажа (лепка барады, капелюша, касічкі і іншых частак). Нанясенне малюнка стэкай. Абазначэнне дробнымі ляпнымі дэталямі элементаў адзення.

Вырабы. Стылізаваныя аб’ёмныя выявы птушак (гусь, кураня і іншыя птушкі), звяроў (медзведзяня, ліса, заяц, вавёрка, кот і іншыя жывёлы), казачных персанажаў і людзей (Снягурачка, дзяўчынка і іншыя персанажы).

Работа з паперай і кардонам (20 гадзін)
Тэарэтычныя звесткі

Мазаіка з паперы, яе віды («рванка», з выбітых дзіркаколам кружочкаў), выкарыстанне мазаікі для ўпрыгожвання іншых вырабаў і ў якасці пано. Прызначэнне капіравальнай паперы, правілы капіравання малюнка. Правілы наклейвання дробных дэталей. Прызначэнне і правілы вырабу акантоўкі. Спалучэнне колеру фону, выявы і акантоўкі. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з прадметамі з вострымі канцамі.

Правілы вымярэння памераў лінейкай і выканання разметкі па лінейцы.

Прызначэнне рыцоўкі, правілы яе якаснага і бяспечнага выканання. Канструктыўныя часткі пераплётных кніг: пераплётная накрыўка (карашок старонкі), вокладка, папка, блок, сшыткі. Матэрыялы для пераплётных работ: каленкор, ледэрын, марля, тасьма. Асаблівасці склейвання тканін. Канструяванне з гатовых форм.

Аперацыі і прыёмы працы. Нарыхтоўка дэталей мазаікі. Перавод малюнка праз капіравальную паперу. Наклейванне дробных дэталей (элементы мазаікі і іншыя дэталі)

падручнымі прадметамі (выкарыстаны стрыжань шарыкавай ручкі, завостраная палачка і іншыя прадметы).

Вымярэнне ўзораў і шаблонаў лінейкай (у сантыметрах). Разметка па лінейцы (сумяшчэнне дзялення «0» лінейкі з краем загатоўкі, адкладванне памераў, злучэнне рысак па лінейцы).

Выраб акантовачных палос з абразаннем іх канцоў пад вуглом 45°. Наклейванне акантоўкі. Наразанне і наклейванне дробных дэталей з матэрыялаадходаў (фольга або іншыя матэрыялы). Прышыванне завязак на вырабы з паперы або кардону.

Рыцаванне кардону і шчыльнай паперы. Прыём згінання кардону з выкананнем надразання лініі згібу.

Падклейванне старонак, вокладак, карашкоў кніг і часопісаў. Наклейванне дэталей з тканіны на паперу і кардон.

Практыкаванні ў дробным рамонце кніг і часопісаў, іх абгортцы.

Вырабы. Закладкі і паштоўкі, упрыгожаныя простымі ўзорамі і прадметнымі мазаічнымі выявамі (элементамі мазаікі запаўняецца толькі іх контур). Мазаічныя пано ў выглядзе простых выяў (груша, мяч, караблік, цюльпан і іншыя выявы) з акантоўкай з палос паперы. Карнавальныя паўмаскі (акуляры) са шчыльнай паперы або тонкага кардону.

Папка з кардону. Мадэлі (стол, крэсла, фатэль, лавачка) з паперы, кардону, скрыначак. Скрынкі з кардону, склееныя па стыках, з клапанамі (бакавіны ўпрыгожваюцца малюнкамі або аплікацыяй).

Работа з тэкстыльнымі матэрыяламі (12 гадзін)

Тэарэтычныя звесткі

Разнастайнасць (асартымент) тканін. Знешнія прыкметы найбольш распаўсюджаных тканін. Знешні выгляд і правілы выканання касога абкідвальнага шва. Выкарыстанне абкідвальнага шва для ўмацавання і ўпрыгожвання краю вырабу. Выкарыстанне касога абкідвальнага шва для злучэння дэталей вырабу. Спосабы прышывання гузікаў з чатырма адтулінамі.

Аперацыі і прыёмы працы. Сшыванне дэталей вырабу касым абкідвальным швом. Прышыванне гузікаў з чатырма адтулінамі паралельнымі і перакрыжаванымі шыўкамі. Выцягванне нітак з тканіны пры афармленні сурвэткі, закладкі.

Практыкаванні ў прышыванні гузікаў з чатырма адтулінамі на швейныя вырабы.

Вырабы. Закладка з цэлулоіду з каляровым укладышам. Футляр для нажніц з кардону або цыраты (упрыгожваецца простай вышыўкай ці аплікацыяй). Іголньніца (па самастойна складзенай выкрайцы). Закладкі і сурвэткі, аформленыя фастрыгай і абкідвальным швом, а таксама выцягваннем нітак.

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ (28 гадзін)

Работа з падручнымі матэрыяламі

Тэарэтычныя звесткі

Ужыванне падручных матэрыялаў (пластыкавыя флаконы, палачкі для марожанага, іншыя выкарыстаныя драўляныя вырабы) у спалучэнні з іншымі матэрыяламі (прыродныя, папера, скотч, лейкапластыр, ніткі, тканіна) для стварэння простых вырабаў. Абсталяванне рабочага месца, санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ з выкарыстаннем падручных матэрыялаў.

Аперацыі і прыёмы працы. Наклейванне, абклейванне, рэзанне, сшыванне, афарбоўванне матэрыялаў.

Вырабы. Аловачніца, вазачкі, фігуркі казачных персанажаў.

Сіметрычнае выразанне

Тэарэтычныя звесткі

Сіметрычнае выразанне як від народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Аперацыі і прыёмы працы. Выразанне з аркуша, складзенага ўдвая, у чатыры разы, па знешнім і ўнутраным контуры.

Вырабы. Навагоднія ўзоры, пано (прадметныя выявы, простыя кампазіцыі з выяў некалькіх прадметаў).

Аплікацыя з розных матэрыялаў

Тэарэтычныя звесткі

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з сыпкімі матэрыяламі, ватай, лускавінкамі шышак, яечнай шкарлупінай. Уласцівасці матэрыялаў, якія выкарыстоўваюцца ў рабоце. Матэрыялы для фону. Клеявыя саставы для аплікацыі з розных матэрыялаў (казеінавы клей, клей ПВА).

Аперацыі і прыёмы працы. Нарыхтоўка пілавіння, драбленне яечнай шкарлупіны, сушка выкарыстанай чайнай заваркі. Наклейванне сыпкіх матэрыялаў (нанясенне клею роўным пластом, насыпанне матэрыялу на клей, прыцісканне). Расслаенне і наклейванне ваты (нанясенне малюнка на адным баку паперы, наклейванне ваты на другім баку, выразанне па контуры малюнка, наклейванне паперы на фон). Наклейванне мазаічных элементаў з лускавінак шышак, кавалачкаў яечнай шкарлупіны. Афарбоўванне вырабаў, дамалёўка дробных дэталей.

Вырабы. Аплікацыі з сыпкіх матэрыялаў (дробныя дэталі зроблены з паперы або дамаляваны): «Кураня», «Грыбок», «Груша», «Кацяня» і іншыя аплікацыі. Аплікацыі з ваты: «Снегавік», «Зайчык», «Мішка», «Лебедзь» і іншыя аплікацыі. Аплікацыі з іншых матэрыялаў: «Сланяня» з яечнай шкарлупіны, «Вожык» і іншыя аплікацыі з лускавінак шышак у спалучэнні са звычайнай аплікацыяй, малюнкам. Кампазіцыя «Лебедзь на возеры» з ваты і іншых матэрыялаў.

Работа з саломкай (аплікацыя)

Тэарэтычныя звесткі

Уласцівасці саломкі (цвёрдасць, бляск, афарбоўка). Выкарыстанне аплікацыі з саломкі ў якасці пано і для ўпрыгожвання іншых вырабаў. Злакавыя расліны, сцябло якіх выкарыстоўваецца для аплікацыі. Паслядоўнасць падрыхтоўкі саломкі да работы. Правілы бяспечных паводзін пры апрацоўцы саломкі. Рацыянальныя спосабы выканання аплікацыі з саломкі з запоўненым контурам (выкананне малюнка на адным баку паперы, наклейванне саломкі на другім баку, выразанне выявы і наклейванне яе на фон).

Назіранне за падрыхтоўкай саломкі да работы.

Аперацыі і прыёмы працы. Рэзанне нажніцамі і наклейванне саломкі.

Вырабы. Закладкі, каробачкі і іншыя вырабы, упрыгожаныя простымі ўзорамі з саломкі. Пано ў выглядзе прадметных аплікацый і кампазіцый.

Вышыванне

Тэарэтычныя звесткі

Аперацыі і прыёмы працы. Сшывальныя і ўпрыгожвальныя швы.

Выкананне шва строчкі, сцябліністага, тамбурнага, пяцельнага.

Вырабы. Закладкі і сурвэткі, іншыя простыя вырабы, упрыгожаныя вышыўкай.

Работа з канструктарамі

Тэарэтычныя звесткі

Назвы і канструктыўныя асаблівасці дэталей выкарыстанага набору канструктара. Інструменты набору металаканструктара. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечных паводзін на занятках з канструктарам. Агульныя звесткі аб прафесіі слесара-зборшчыка.

Экскурсія ў школьную слясарную майстэрню (майстэрню па апрацоўцы металаў).

Аперацыі і прыёмы працы. Злучэнне дэталей. Разборка злучэнняў.

Практычныя работы

Канструяванне па ўзоры, канструяванне па тэхнічным малюнку з дэталей набору канструктара (будаўнічы драўляны, пластмасавы, металічны).

Вырошчванне раслін на прышкольным вучэбна-доследным участку

Тэарэтычныя звесткі

Харчовае значэнне гародніны. Правілы ўборкі і захоўвання ўраджаю гародніны. Значэнне восеньскай перакопкі глебы. Значэнне ўгнаенняў.

Знешні выгляд вывучаемых раслін і іх насення. Глыбіня разорак пры пасеве насення розных культур. Метр як адзінка вымярэння. Правілы разметкі ўчастка.

Назіранне за ўнясеннем угнаенняў і падкормкай раслін.

Практыкаванні ў распазнаванні насення і распазнаванні ўсходаў культурных раслін і пустазелля.

Восеньскія практычныя работы. Удзел ва ўборцы ўраджаю гародніны на прышкольным вучэбна-доследным участку. Падрыхтоўка прышкольнага вучэбна-доследнага ўчастка да восеньскай апрацоўкі глебы.

Вясновыя практычныя работы. Сарціроўка і адбор паўнавартаснага насення. Рыхленне і разраўноўванне глебы граблямі. Разметка класнай дзялянкі. Пасеў буйнога і дробнага насення (культуры на выбар настаўніка). Догляд пасеваў і ўсходаў (паліў, рыхленне глебы, праполка). Збор зяленіўных культур.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ IV КЛАСА

Вучні ведаюць:

назвы вывучаных хатніх раслін у памяшканнях школы і раслін кветніка;

вывучаныя матэрыялы для дзіцячай працы і звесткі аб іх;

абсталяванне для практычных работ, якія выконваліся, вывучаныя звесткі пра яго;

прызначэнне, паслядоўнасць і правілы выканання вывучаных аперацый.

Вучні ўмеюць:

выконваць асноўныя прыёмы, якія ўваходзяць у састаў вывучаных аперацый апрацоўкі матэрыялаў для дзіцячай працы, па доглядзе хатніх раслін і раслін кветніка;

выконваць разметку па лінейцы (па ўзоры, памеры задаюцца ў сантыметрах);

выкарыстоўваць эканомна для дзіцячай ручной працы;

арыентавацца ў заданні па пытаннях настаўніка (пры выкананні новых відаў вырабаў) і самастойна (пры выкананні вырабаў, аналагічных раней выкананым);

папярэдне планаваць усе этапы работы і даваць справаздачу аб яе выкананні з дапамогай пытанняў настаўніка аб асобных (больш складаных) этапах і самастойна (з апорай на тэхналагічную карту);

выкарыстоўваць пры планаванні і ў працэсе работы кароткія пісьмовыя інструкцыі (пісьмовы план);

ажыццяўляць бягучы і выніковы канстатуючы самакантроль з выкарыстаннем вымярэнняў лінейкай;

ажыццяўляць дэталёвы аналіз свайго вырабу і вырабу таварыша, іх параўнанне з узорам з мінімальнай дапамогай настаўніка;

прымяняць з дапамогай настаўніка ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах вучэбных заняткаў веды, атрыманыя на вучэбных занятках па іншых вучэбных прадметах;

ажыццяўляць самаацэнку з дапамогай настаўніка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін, правілы арганізацыі рабочага месца на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў працэсе пазаўрочнай працоўнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уяўленні аб прыродных матэрыялах (форма, колер і іншыя характарыстыкі) пры іх падборы з дапамогай настаўніка для ствараемых вырабаў;

вырашаць з дапамогай настаўніка простыя задачы на дакanструяванне (падбор адсутных элементаў) і перакanструяванне (змена асобных элементаў) у працэсе арыенціроўкі ў заданні.

V КЛАС (140 гадзін)

ІНВАРЫЯНТНЫ КАМПАНЕНТ

Тэхнічная графіка (2 гадзіны)

Тэарэтычныя звесткі. Спосабы адлюстравання прадметаў: мастацкі і тэхнічны малюнак, фатаграфія, чарцёж; іх адрозненні.

Міліметр як асноўная адзінка вымярэння памеру на чарцяжах. Лініі чарцяжа.

Практыкаванні ў чытанні чарцяжоў плоскіх геаметрычных фігур, тэхнічных малюнкаў розных прадметаў.

Работа з паперай і кардонам (34 гадзіны)

Аплікацыя

Тэарэтычныя звесткі

Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін, арганізацыя рабочага месца пры рабоце з паперай і кардонам. Разнастайнасць відаў паперы і іх прымяненне. Асноўныя віды клею для работы з паперай і яго ўласцівасці. Пэндзлі для клею. Правілы нанясення клею пры наклейванні аплікатыўных дэталей. Адзінкі вымярэння даўжыні (метр, сантыметр, міліметр). Прызначэнне і будова вымяральнай лінейкі і вугольніка. Паслядоўнасць разметкі прамавугольных дэталей з дапамогай лінейкі і вугольніка.

Практычныя работы

Разметка дэталей па шаблонах. Разметка дэталей з дапамогай лінейкі і вугольніка. Выразанне дэталей нажніцамі па лініях разметкі. Папярэдняе размяшчэнне дэталей на месцы наклейвання. Наклейванне аплікатыўных дэталей.

Вырабы. Закладкі і паштоўкі, упрыгожаныя геаметрычным і раслінным арнаментамі.

Аб’ёмныя вырабы з кардону

Тэарэтычныя звесткі

Віды і ўласцівасці кардону. Паняцце разгорткі. Чарцёж, эскіз, тэхнічны малюнак. Умоўныя лініі і іх абазначэнне. Прызначэнне і будова фальцлінейкі. Правілы бяспечных паводзін пры выкананні рыцоўкі.

Практычныя работы

Разметка загатоўкі (ліст кардону). Разметка аплікатыўных дэталей. Выразанне разгорткі. Рыцоўка разгорткі. Выкананне надрэзаў. Выразанне аплікатыўных дэталей. Адгінанне частак каробкі. Склейванне клапанаў. Наклейванне аплікатыўных дэталей.

Вырабы. Адкрытыя каробкі.

Пакеты і канверты

Тэарэтычныя звесткі

Разнастайнасць пакетаў, канвертаў і сітуацыі іх прымянення. Віды паперы для вырабу пакетаў і канвертаў. Паняцце фальцоўкі. Гладзілка і яе прызначэнне.

Практычныя работы

Выраб пакетаў і канвертаў розных канструкцый з гатовых і самастойна выкананых разгортак.

Вырабы. Пакеты і канверты розных канструкцый і памераў.

Швейныя ручныя работы (34 гадзіны)

Матэрыялазнаўства

Тэарэтычныя звесткі

Віды тэкстыльных валокнаў. Кароткія звесткі аб вытворчасці тканіны. Аснова і ўток тканіны, правы і вываратны бакі тканіны. Палатнянае перапляценне. Прафесіі рабочых швейнай вытворчасці. Народнае ткацтва Беларусі.

Лабараторна-практычныя работы:

1. Вызначэнне правага і вываратнага бакоў тканіны.
2. Выраб узораў палатнянага перапляцення.

Шыццё па гатовым крoі

Тэарэтычныя звесткі

Звесткі аб тканінах для рэкамендаваных вырабаў. Ніткі для шыцця і вышывання.

Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечных паводзін пры шыцці і вышыванні.

Ручное сшывальнае шво, шво ўпадгінку з закрытым зрэзам, абкідвальнае (пяцельнае) шво, іх прызначэнне і тэхналогія выканання. Упрыгожвальныя швы (сцябліністы, крыжападобны), іх знешні выгляд і тэхналогія выканання.

Практыкаванні ў выкананні ручных швоў на ўзорах.

Практычныя работы

Шыццё вырабаў з прымяненнем сшывальнага шва, шва ўпадгінку з закрытым зрэзам і абкідвальнага (пяцельнага) шва. Выкананне на вырабе ўпрыгожвальных швоў.

Вырабы. Падушачка для іголак, мяшочак для захоўвання работ.

Стварэнне вырабаў па выкрайцы

Тэарэтычныя звесткі

Чарцёж швейнага вырабу. Выкрайка. Інструменты і матэрыялы, неабходныя для выканання выкраек. Асноўныя і дапаможныя лініі чарцяжа выкрайкі. Абазначэнне памераў. Звесткі аб тканінах для рэкамендаваных вырабаў. Упрыгожвальныя швы (тамбурны), знешні выгляд і тэхналогія выканання. Уключэнне і выключэнне электрапраса, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электрапрасам.

Практыкаванні ў выкананні ручных швоў на ўзорах.

Практычныя работы

Выраб чарцяжоў квадратнай і прамавугольнай форм. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскрой тканіны па гатовай і самастойна складзенай выкрайках. Раскрой вырабу па выцягнутых нітках. Выкананне на вырабе ўпрыгожвальных швоў. Выкананне махроў. Вільготна-цеплавая апрацоўка швейных вырабаў.

Вырабы. Сурвэтка, закладка.

Рамонт адзення

Тэарэтычныя звесткі

Віды работ па рамонце адзення: прышыванне гузікаў, прышыванне вешалкі, рамонт па распоратым шве і разарваным месцы, накладанне латкі, цыраванне. Віды гузікаў і спосабы іх прышывання. Швы, якія прымяняюцца для прышывання вешалкі, рамонту па распоратым шве.

Практычныя работы

Падбор гузікаў і нітак, падрыхтоўка бялізны і адзення да рамонту. Прышыванне гузікаў. Падбор і прышыванне вешалкі. Рамонт па распоратым шве (складанне тканіны па распоратым шве; сшыванне шва ручным сшывальным швом; прасаванне).

ВАРЫЯТЫЎНЫ КАМПАНЕНТ (70 гадзін)

Швейныя машынныя работы

Машыназнаўства і матэрыялазнаўства

Тэарэтычныя звесткі

Вучэбны кабінет (вучэбна-вытворчая майстэрня). Правілы бяспечных паводзін у вучэбным кабінеце (вучэбна-вытворчай майстэрні). Вучэбнае месца для выканання швейных вырабаў, патрабаванні да яго арганізацыі. Рабочае адзенне. Яго захоўванне.

Прызначэнне і сфера прымянення бытавой швейнай машыны. Агульныя звесткі аб відах бытавых швейных машын, інструкцыях па эксплуатацыі. Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры рабоце на бытавой швейнай машыне. Паслядоўнасць падрыхтоўкі бытавой швейнай машыны да работы.

Сшывальныя швы: у запрасоўку, у распрасоўку. Шво ўпадгінку з закрытым зрэзам.

Звесткі аб тканінах для рэкамендаваных вырабаў.

Практыкаванні

Знешні агляд машыны. Падрыхтоўка бытавой швейнай машыны да работы. Намотванне ніткі на шпульку, заправка верхняй і ніжняй нітак. Выкананне строчкі па прамых і закругленых лініях з ніткай па паперы і тканіне. Выкананне ўзораў сшывальнага шва і шва ўпадгінку з закрытым зрэзам.

Выкананне швейных вырабаў

Тэарэтычныя звесткі

Паслядоўнасць выканання работ па выкананні простых швейных вырабаў.

Практычныя работы

Выраб чарцяжоў квадратнай і прамавугольнай форм. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскрой тканіны па гатовай і самастойна складзенай выкрайках. Шыццё вырабаў з прымяненнем шва ўпадгінку з закрытым зрэзам і сшывальнага. Вільготна-цеплавая апрацоўка швейных вырабаў.

Вырабы. Павязка для дзяжурнага, сурвэткі і іншыя вырабы.

Асновы прыгатавання ежы

Гігіена харчавання

Тэарэтычныя звесткі

Вучэбны кабінет, яго абсталяванне. Агульныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін пры рабоце ў вучэбным кабінеце. Агульныя патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання і іх захоўвання.

Кухня і яе абсталяванне. Агульныя звесткі аб гігіене памяшкання і абсталяванні кухні. Спецадзенне. Правілы асабістай гігіены і бяспечных паводзін пры гатаванні ежы.

Экскурсія ў школьны харчаблок.

Назіранне за захоўваннем прадуктаў харчавання ў школьным харчаблоку.

Практычныя работы

Мыццё садавіны, гародніны.

Прадукты харчавання

Тэарэтычныя звесткі

Значэнне харчавання. Асноўныя прадукты харчавання. Рацыянальнае харчаванне – умова захавання здароўя. Агульныя правілы захоўвання прадуктаў харчавання.

Харчовая вартасць хлеба, беражлівыя адносіны да хлеба. Выкарыстанне хлебных адходаў. Бяспека работы пры наразанні хлеба ўручную.

Практычныя работы

Выраб паніровачных сухароў з сушанага хлеба. Наразанне хлеба ўручную.

Сервіроўка стала

Тэарэтычныя звесткі

Паняцце аб сервіроўцы стала. Паняцце аб меню. Паслядоўнасць сервіроўкі стала да снедання.

Практычныя работы

Складанне меню для снедання. Сервіроўка стала да снедання.

Прыгатаванне гарачых напіткаў

Тэарэтычныя звесткі

Гарачыя напоі (чай, какава, кава), іх значэнне ў харчаванні чалавека і спосабы прыгатавання. Арганізацыя рабочага месца, правілы бяспечных паводзін пры гатаванні гарачых напіткаў.

Практычныя работы

Заварванне чаю. Прыгатаванне какавы з какава-парашку. Мыццё чайнага посуду.

Прыгатаванне бутэрбродаў

Тэарэтычныя звесткі

Бутэрброды і іх віды. Тэхналогія прыгатавання і афармлення бутэрбродаў. Арганізацыя рабочага месца, правілы бяспечных паводзін пры прыгатаванні бутэрбродаў.

Практычныя работы

Прыгатаванне адкрытых і закрытых, простых і камбінаваных бутэрбродаў. Мыццё посуду.

Апрацоўка металаў (работа з мяккім дротам у абалонцы)

Тэарэтычныя звесткі

Вучэбны кабінет (вучэбна-вытворчая майстэрня). Правілы бяспечных паводзін у кабінеце (вучэбна-вытворчай майстэрні). Вучэбнае месца для ручной апрацоўкі металаў, патрабаванні да яго арганізацыі. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення.

Прызначэнне і будова слясарных ціскоў. Правілы работы са слясарнымі ціскамі.

Алюмініевы, медны і сталёвы дрот. Агульныя і адметныя ўласцівасці дроту з розных металаў. Прымяненне дроту ў побыце і народнай гаспадарцы. Інструменты і прыстасаванні для работы з дротам (металічная лінейка, вастрагубцы). Правілы бяспечных паводзін пры апрацоўцы дроту.

Прафесіі слесара-інструментальшчыка і слесара механазборачных работ.

Практычныя работы

Разметка загатовак з дроту. Адкусванне дроту кусачкамі. Выгінанне мяккага дроту рукамі. Навіванне спіралі на апраўкі. Выгінанне дроту пласкагубцамі. Злучэнне канцоў дроту скручваннем.

Вырабы. Геаметрычныя фігуры, ланцужок, контурныя выявы раслін і жывёл.

Апрацоўка драўніны

Пілаванне ў стусле з абмежавальнікам

Тэарэтычныя звесткі

Вучэбны кабінет (вучэбна-вытворчая майстэрня). Правілы бяспечных паводзін у кабінеце (вучэбна-вытворчай майстэрні). Вучэбнае месца для ручной апрацоўкі драўніны, патрабаванні да яго арганізацыі. Прызначэнне і будова сталярнага варштата. Размяшчэнне на варштаце інструментаў і матэрыялаў. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення.

Пароды драўніны і іх уласцівасці. Матэрыялы з драўніны.

Базавы бок загатоўкі. Інструменты і прыстасаванні для пілавання ў стусле: стусла з абмежавальнікам, нажоўка, іх прызначэнне і будова.

Шліфавальная шкурка. Прыстасаванні для шліфавання. Правілы бяспечных паводзін пры пілаванні і шліфаванні.

Прафесія сталяра.

Практычныя работы

Разметка загатовак па шаблонах, лінейцы і сталярным вугольніку. Замацаванне стусла ў заціску варштата. Пілаванне ў стусле з абмежавальнікам. Праверка прамалінейнасці адпілаванай дэталі. Зачыстка дэталей шліфавальнай шкуркай.

Вырабы. Цацачны будаўнічы матэрыял, нарыхтоўкі для мадэлей мэблі.

Зборка вырабаў з драўніны

Тэарэтычныя звесткі

Агульныя звесткі аб злучэннях на клеі, цвіках. Звесткі аб клеі ПВА. Віды цвікоў. Малаток. Правілы бяспечных паводзін пры выкананні злучэнняў на клеі, цвіках.

Практычныя работы

Зборка злучэнняў на клеі, цвіках.

Вырабы. Мадэлі мэблі.

Выпілоўванне лобзікам

Тэарэтычныя звесткі

Лобзік, яго прызначэнне і будова. Выпіловачны столік, яго мацаванне да варштата. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з лобзікам.

Шыла, яго прызначэнне, будова. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з шылам. Спіральныя свердлы. Калаўрот, яго прызначэнне і будова. Правілы бяспечных паводзін пры свідраванні.

Капіравальная папера. Правілы пераводу малюнка праз капіравальную паперу.

Фанера для выпілоўвання.

Практычныя работы

Падбор фанеры. Зачыстка фанеры шліфавальнай шкуркай. Перавод малюнка праз капіравальную паперу, намётка прыпуску. Прасвідроўванне адтулін ва ўнутраных контурах. Выпілоўванне ўнутраных контураў. Выпілоўванне па вонкавых контурах. Аздабленне вырабу.

Вырабы. Літары для стэндаў, фігуркі звяроў і птушак.

Выпальванне па драўніне

Тэарэтычныя звесткі

Будова і прымяненне прыбора для выпальвання. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электравыпальвальнікам. Арганізацыя рабочага месца пры выпальванні.

Практычныя работы

Зачыстка асновы. Выбар і апрацоўка капіравальнай паперы (здыманне лішняй фарбы), перавод малюнка. Выпальванне. Размалёўванне.

Вырабы. Літары для стэндаў, фігуркі звяроў і птушак.

Пачатковае мадэляванне

Тэарэтычныя звесткі. Назвы дэталей набору канструктара, які выкарыстоўваецца, і іх злучэнняў. Інструменты набору канструктара. Арганізацыя рабочага месца і правілы бяспечных паводзін на занятках з канструктарам.

Практычныя работы

Канструяванне па ўзоры, тэхнічным малюнку, па задуме.

Вырабы. Мадэлі мэблі, машын і іншых вырабаў.

Работы ў галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі

Агародніцтва

Тэарэтычныя звесткі

Гародніна як прадукты харчавання. Тэрміны ўборкі гародніны, значэнне іх выканання. Інвентар для ўборкі гародніны, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з ім. Правілы ўборкі, сарціроўкі і захоўвання гародніны.

Значэнне восеньскай і вясновай апрацоўкі глебы. Асаблівасці восеньскай і вясновай апрацоўкі глебы для вырошчвання гароднінных культур.

Прафесія агародніка.

Практычныя работы

Уборка бульбы, буракоў, морквы і іншых агароднінных культур. Уборка рэшткаў. Рыхленне глебы. Пасеў агароднінных культур.

Жывёлагадоўля

Тэарэтычныя звесткі

Сельскагаспадарчая жывёлагадоўля. Галіны жывёлагадоўлі. Прафесіі работнікаў жывёлагадоўлі.

Жывёлагадоўчыя памяшканні. Агульныя правілы па доглядзе жывёлы. Інвентар для ўборкі жывёлагадоўчых памяшканняў, правілы іх уборкі.

Асаблівасці кармлення жывёл, якія змяшчаюцца ў прышкольнай гаспадарцы. Санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін у жывёлагадоўчых памяшканнях.

Практычныя работы

Удзел у кармленні свойскіх птушак (куры, качкі, гусі, індычкі).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ V КЛАСА

Вучні ведаюць:

арганізацыю і абсталяванне вучэбнага кабінета (вучэбна-вытворчай майстэрні);

спосабы адлюстравання прадметаў (мастацкі і тэхнічны малюнкі, фатаграфія, чарцёж), іх адрозненні;

канструкцыйныя матэрыялы, якія вывучаліся, іх уласцівасці;

сельскагаспадарчыя расліны і жывёлы, харчовыя прадукты, кулінарныя стравы;

вывучаныя інструменты, прыстасаванні.

Вучні ўмеюць:

выконваць вывучаныя аперацыі апрацоўкі матэрыялаў для дзіцячай працы, па прыгатаванні ежы, у сферы агародніцтва і жывёлагадоўлі;

выкарыстоўваць эканомна для работы;

арыентавацца ў новых заданнях з дапамогай настаўніка, аналагічных і выкананых раней – самастойна або з нязначнай дапамогай;

выкарыстоўваць у працэсе арыенціроўкі ў заданні знаёмыя віды тэхнічнай нагляднасці;

планаваць работу ў групавой гутарцы, выкарыстоўваць пры планаванні работы тэхналагічную карту з дапамогай настаўніка і самастойна;

ажыццяўляць бягучы і выніковы кантроль з дапамогай настаўніка і самастойна;

выкарыстоўваць пры замеры прадметаў кантрольна-вымяральныя інструменты (лінейкі, вугольнікі);

даваць справаздачу аб выкананай рабоце з дапамогай настаўніка і самастойна;

ажыццяўляць самаацэнку з дапамогай настаўніка і самастойна;

прымяняць з дапамогай настаўніка ў працэсе арыенціроўкі ў заданні і на іншых этапах вучэбных заняткаў веды, атрыманыя на вучэбных занятках па іншых вучэбных прадметах.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні, патрабаванні гігіенічных нарматываў, правілы бяспечных паводзін, правілы арганізацыі рабочага месца на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў працэсе пазаўрочнай працоўнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

атрыманыя веды і ўменні пры ўдзеле ў конкурсах, святах, аглядах і іншых мерапрыемствах.